**ШАМЯТКОЎ Леанід Аляксандравіч, нарадзіўся 3.7.1937 г. у Гомелі**

Матэматык-алгебраіст, чден-карэспандэнт Нацыянальнай АН Беларусі (1980), доктар фізіка-матэматычных навук (1970), прафесар (1973). Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1995). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1959), аспірантуру акадэміка АН Беларусі С.А.Чуніхіна. З 1962 г. працаваўу Гомелі ў лабараторыі тэорыі канечных груп Інстытута матэматыкі Нацыянальнай АН Беларусі. З 1977 г. прарэктар па вучэбнай рабоце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, з 1989 г. рэктар універсітэта.

Навукова-педагагічная дзейнасць Л. А. Шамяткова надзвычай інтэнсіўная. Ужо ў І960-я гг. Яго імя стала вядома далёка за межамі нашай краіны. Ён знайшоў рашэнне праблемы расшырэння груп, пастаўленай нямецкім матэматыкам Вілантам у 1958 г., а таксама праблемы Дз. К. Фадзеева, якая заставалася нявырашанай з 1947 г. Л.Л.Шамяткоў, працягваючы тэматыку свайго настаўніка С.Л.Чуніхіна, атрымаў шараг завяршаючых вынікаў сілаўскіх якасцей і тэорыі індэксіалаў. Гомельскі вучоны з'яўляецца стваральнікам і кіраўніком новага навуковага напрамку тэорыі фармацый. Ім вырашаны шэраг буйных навуковых праблем. Адной з іх з'яўляецца праблема фармацыйнай стабільнасці, якую доўгі час не маглі вырашыць нават такія вядомыя матэматыкі, як Бэр і Хуперт. Прызнаннем навуковых заслуг Л.А.Шамяткова стала абранне яго членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Л.А.Шамяткоў падрыхтаваў 29 кандыдатаў навук, 5 яго выхаванцаў абаранілі доктарскія дысертацыі. Адным з вучняў Леаніда Аляксандравіча з'яўляецца кітайскі прафесар Го Вэньбінь, які займаецца навуковай дзейнасцю ва ўніверсітэце г. Янчжоў. У 1989 г. Л.А.Шамяткоў у сааўтарстве з Б.В.Бокуцем і І.Ф.Харламавым выдаў манаграфію «Вузаўскае навучанпе», у якой разглядаюцца пытанні актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны па яго ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле створаны саветы па абароне дысертацый па 5 спецыяльнасцях (раней не было ні аднаго). Вучоны ўзначальвае доктарскі савет па спецыяльнасці матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лічбаў. Пад кіраўніцтвам рэктара Л.А.Шамяткова ва ўніверсітэце адкрыты новыя спецыяльнасці, у 1,5 разы павялічылася колькасць дактароў навук, пашырылася міжнароднае супрацоўніцтва з універсітэтамі Францыі, Германіі, Англіі, Італіі, Іспаніі.

У.Стэльмах.